ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэту
А.В.Клімовіч
2025 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір” (далей – Выстаўка-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: адраджэнне, захаванне і папулярызацыя розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і традыцыйных рамёстваў, творчасці народных майстроў і носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; павелічэнне асартыменту і якасці сувенірнай прадукцыі, якая адлюстроўвае традыцыйную культуру, рэгіянальныя асаблівасці мастацка-рамесніцкіх традыцый Гродзеншчыны; павышэнне турыстычнага патэнцыялу рэгіёну; далучэнне шырокай грамадскасці да лепшых твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

3. Арганізатарамі Выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” (Дадатак 1).

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Выстаўкі-конкурсу арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. У Выстаўцы-конкурсе прымаюць удзел майстры народнай творчасці раённых Цэнтраў (Дамоў) рамёстваў, аддзелаў (сектараў) рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, асобныя таленавітыя майстры, носьбіты традыцый культурнай спадчыны Гродзеншчыны.

6. Выстаўка-конкурс праводзіцца ў два этапы: 1 этап (адборачны) – адбор работ канкурсантаў па фотаздымках; 2 этап (заключны) – будзе праходзіць з 1 чэрвеня па 31 жніўня 2025 г. у дэманстрацыйнай зале ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

7. Для ўдзелу ў 1 этапе Выстаўкі-конкурсу неабходна да 16 мая 2025 г. даслаць заяўку (Дадатак 2) і фотаздымкі работ на электронны адрас ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” info@gromc.by.

8. Аргкамітэт адбірае работы канкурсантаў і дасылае афіцыйныя запрашэнні.

9. Пераможцы Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ў рамках лаўрэата (I, II, III ступені) і прызамі ў наступных намінацыях:

“Лепшы выраб у тэхніцы саламянай пластыкі” (Тэматыка вырабаў: народныя лялькі, птушкі, жывёлы, казачныя персанажы, міфалагічныя істоты і інш. Памеры – ад 30 да 50 см.);

“Лепшае пано ў тэхніцы саломапляцення і аплікацыі саломкай” (Тэматыка вырабаў: адлюстроўванне агульнабеларускіх каштоўнасцей, традыцыі нацыянальнай культуры, прыгажосці беларускай прыроды, гродзенскага краю. Памеры – ад 50 да 100 см.);

“Лепшы дэкаратыўны выраб з лазы” (ацэньваецца аўтарская калекцыя дэкаратыўных вырабаў (да 5-ці экс.) з утылітарнымі і мастацкімі функцыямі: побытавыя вырабы, пано, скульптура, прадметы інтэр’еру і інш.);

“Лепшае пано ў тэхніцы выцінанкі” (ацэньваецца мастацкі ўзровень работ, выкарыстанне ў работах народных традыцый, іх тактоўная аўтарская інтэрпрэтацыя);

“Лепшы сувенір у тэхніцы народнага разьбярства “скульптурная пластыка” (тэматыка работ: персанажы народных казак, істоты беларускай міфаогіі. Памеры: вышыня ад 40 да 60 см., дыяметр ад 15 да 30 см.);

“Лепшая калекцыя ганчарных вырабаў” (ацэньваецца аўтарская калекцыя ганчарных вырабаў (да 5-ці экс.);

“Лепшы выраб дэкаратыўнай глінянай пластыкі “гліняная цацка, акарына” (ацэньваецца аўтарская калекцыя керамічных вырабаў (да 5-ці экс.).

10. Асобныя лепшыя работы адзначаюцца наступнымі спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках:

“За глыбіню вобразнага раскрыцця тэмы”;

“За арыгінальнасць кампазіцыйнага рашэння”;

“За пераемнасць народных традыцый”;

“За крэатыўнае мастацкае мысленне”;

“За інтэрпрэтацыю народных традыцый у творчасці”.

11. Конкурсныя работы, прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс, павінны быць творчымі і арыгінальнымі, адлюстроўваць агульнабеларускія каштоўнасці, выкананы згодна з мастацка-рамесніцкімі традыцыямі Гродзеншчыны, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў, дапушчальна эксперыментаванне.

12. Усе астатнія ўдзельнікі Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

13. Конкурсныя работы лаўрэатаў I, II, III ступені не вяртаюцца аўтарам, застаюцца ў выставачным фондзе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

14. Адабраныя аргкамітэтам на 2 этап конкурсныя работы неабходна прадставіць да 27 мая 2025 г. па адрасе: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. Даведкі па тэл.: +375 152 687934, 623792.

15. Прадстаўленыя на 2 этап Выстаўкі-конкурсу работы неабходна суправаджаць этыкеткай з указаннем назвы работы, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, матэрыялу і тэхнікі выканання работы, поўнай назвы ўстановы, якую прадстаўляе канкурсант(-ы).

16. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Выстаўкі-конкурсу ці яе адмены па аб’ектыўных прычынах майстры, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

17. Журы (Дадатак 3) мае права прысудзіць у адной намінацыі некалькі дыпломаў лаўрэата II, III ступені з адпаведнымі прызамі ў межах агульнага прызавога фонду альбо не прысвойваць месцы, ці аб’ядноўваць намінацыі.

18. Рашэнне членаў журы па выніках Выстаўкі-конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня падвядзення вынікаў Выстаўкі-конкурсу на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

19. Фінансаванне Выстаўкі-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

20. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, рамак для дыпломаў, выраб дыпломаў.

21. Для фінансавання Выстаўкі-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласной выстаўкі-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

**Форма заяўкі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(рай)выканкама
“___” ________________ 2025 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласной выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку____________________________________
_________________________________________________________________
2. Дата нараджэння_______________________________________________
_________________________________________________________________
3. Месца пражывання, кантактны тэлефон__________________________
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
4. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)
_________________________________________________________________
_________________________________________________________________
5. Поўная назва студыі, калектыву__________________________________
_________________________________________________________________
6. Работы, прадстаўленыя на выстаўку-конкурс:

| № п/п | Намінацыя | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|---|
| 1. | | | |

***Заўвага:*** *да заяўкі дадаецца фота работ.*

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

СКЛАД ЖУРЫ
абласной выстаўкі-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Гарадзенскі сувенір”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы;* |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |